УДК 811.161.3

# "Афарызмы – тэлеграмы мудрасці": Нацыянальная афарыстыка і яе сутнасць

Гаўрош Н.В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

У афарызмах заключаны філасофія і мудрасць жыцця цэлага народа і асобнага чалавека, яго этычныя і эстэтычныя прынцыпы, духоўнасць, культура, традыцыі, якія падаюцца як асноўныя жыццёвыя формулы, як дамінантныя вартасці: *Духоўнасць – святая жывымі* (В. Аколава); *Душой значынна немай быць, / Як свет турбот такі вялікі* (Н. Мацяш). У афарызмах акрэсліваецца крэда нашай нацыі: *Быць людзьмі. / Не толькі імі звацца* (Л. Геніюш).

У навуковай літаратуры для абазначэння афарыстычных адзінак паралельна выкарыстоўваюцца два тэрміны – ***афарызм*** і ***афарыстычнае выслоўе.*** Пад *афарызмам* разумеюць выказванне, якое перадае лагічна закончаную думку (суджэнне) – жыццёвае назіранне, заклік, разважанне, параду і г.д., выражаную ў яскравай, трапнай, лаканічнай форме. Да прыкладу: *І гонар свой – не трэба нам благога, / і звычай свой – па-людску жыць з людзьмі* (Л. Геніюш); *Быць шыпшынаю шыпшыне, / Пакуль зямлі трымагцца карэннем* (Н. Мацяш); *Глядзіце зверху ўніз на травы / Ці на ваду, / Не на людзей* (П. Панчанка). ); *Пакінь адну пасаду – / Быць Чалавекам на зямлі* (С. Грахоўскі).

*Афарыстычнае выслоўе* акрэсліваецца як глыбокая па змесце думка, выказаная невялікай колькасцю слоў, і фактычна выступае як агульная назва для ўсіх відаў трапных выказванняў.

Даследчыкі класіфікуюць афарызмы на *моўныя і маўленчыя.* Да першых адносяць тыя, якія рэгулярна ўзнаўляюцца і зразумелыя без тэксту літаратурнага твора (і аўтара), адкуль яны ўзятыя: *Другі баран – ні "бэ", ні "мя", а любіць гучнае імя* – з байкі К. Крапівы "Дыпламаваны баран"– і маўленчыя, індывідуальна-аўтарскія, афарыстычнасць якіх выяўляецца непасрэдна з кантэксту, са зместу самога літаратурнага твора. Так, змест афарыстычных Купалавых радкоў *Не шукай ты шчасця, долі / На чужым, далёкім полі... / Не шукай сабе, мой братку, з ветрам Бацькаўшчыну-матку* ў поўнай меры зразумелы толькі пасля прачытання верша "Не шукай...", у якім паэт выказвае любоў, вернасць і адданасць роднай Беларусі – адзінай і непаўторнай сваёй Радзіме..

Афарызм укючае ў сябе нібы два планы: гэта *мудрае* выслоўе – план зместу, – выказанае ў трапнай, лаканічнай форме, – план выражэння (просты , складаны сказ, перыяд, нярэдка цэлы афарыстычны тэкст).